7. Maliszewski K. Z dziejów staropolskiej kultury i cywilizacji. Lublin, 2010.
8. Millar S., Dennis P. Vienna 1683: Christian Europe Repels the Ottomans. Osprey Publishing, 2008.
9. Muza polska na wjazd Jana III do Krakowa. Kraków, 1676.
10. Pasek J. Chr. Memoirs of the Polish Baroque: The Writings of Jan Chryzostom Pasek, a Squire of the Commonwealth of Poland and Lithuania. Oakland: University of California Press, 1976.
11. Polish Manuscripts, or The Secret History of the Reign of John Sobieski, The III of that Name, King of Poland, containing a particular account of the siege of Vienna…/ trans. François-Paulin Dalairac (London: Rhodes, Bennet, Bell, Leigh & Midwinter, 1700.
12. Potocki W. Muza polska na tryumfalny wjazd najasniejszego Jana III / Wyd. A. Karpinski. Warszawa, 1996.
13. Varvounis M. Jan Sobieski: The King Who Saved Europe. Xlibris Corporation, 2012.

## ЧЭЛЯДЗЬ ПРЫ ДВАРЫ СТАНІСЛАВА АЎГУСТА ПАНЯТОЎСКАГА ПАДЧАС ЯГО КІРАВАННЯ (1764–1795): ІХ АБАВЯЗКІ І ПАЎСЯДЗЁННАСЦЬ

**Н. І. Васілюк**

Гродна, Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт, nata.vasiliuk2018@yandex.ru

Аўтар даказвае, што пры двары Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Гродне пражывала вялікая колькасць слуг нізкага статусу. Яны працавалі ў стайнях, на кухні, і таму роля гэтых людзей была таксама даволі высокая, так як яны падтрымлівалі чысціню ў замку. Прыдворныя ня мелі ніякіх кантактаў са слугамі.
*Ключавыя словы:* двор; Станіслаў Аўгуст Панятоўскі; Гродна.

The author proves that at the court of Stanislaus August Poniatowski in Grodno lived a large number of servants of low status. They worked in the stables, the kitchen, and so the role of these persons was also quite high, as they maintain cleanliness in the castle. The courtiers had no contact with the servants.
*Keywords:* court; Stanislaus August Poniatowski; Grodno.

Нараду з высокапрывеліяванымі прыдворнымі і асобамі сярэдняга ранга пры двары Станіслава Аўгуста Панятоўскага жылі людзі, якія выконвалі брудную, «чорную» працу (уборка памяшканняў, іх ахова і г. д.). Яны займалі пасады, якія не карысталіся ў прыдворным грамадстве вялікай павагай, а іх самых лічылі звычайнымі слугамі і бачалі ў іх толькі рабочую сілу. У артыкуле прааналізуем асноўныя абавязкі непрывеліяваных асоб пры двары, іх паўсядзённае жыццё, адносіны з іншымі прыдворнымі і з манархам.

Чэлядзь прысутнічала, мабыць, на кожнай з прыдворных службаў. Гэта зразумела, таму што паўсюль былі патрэбны чорнарабочыя. Але, нягледзячы на неабходнасць у іх паслугах, заробак прыдворных дадзенага тыпу быў зусім невялікі, у шмат разоў меншы, чым у асобаў высокага і сярэдняга ранга. Дык вось, пры двары Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Гродна былі наступныя прыдворныя нізкага рангу.

Дастатковая колькасць прыдворных нізкага рангу працавала на каралеўскай кухні. Да іх можна аднесці дапаможнікаў кухараў – кухчыкаў. Яны дапамагалі пры прыгатаванні складаных страваў ці маглі самі гатаваць простыя стравы, якія не мелі складаных інгрэдыентаў. Пры кухарах-майстрах яны вучыліся на працягу некалькіх год. Працуючы на каралеўскай кухні, маладыя кухары на практыцы паглыблялі свае веды і павышалі кваліфікацыю, што дазваляла ім потым заняць больш высокую пазіцыю [8, с. 11]. Іх заробак быў зусім невялікі – запісы Я. П. Тышкевіча, гісторыка і археолага XIX ст., сведчаць, што на кухні Станіслава Аўгуста было 3 кухчыкі і атрымлівалі яны па 21 злп [9, с. 45]. Дарэчы, пры пекарах таксама маглі знаходзіцца вучні – пекарчыкі, якія выконвалі тыя ж самыя абавязкі, што і кухчыкі. Акрамя кухні, у замку існавала цукерня (кандытарская). М. Ф. Дэ-Пуле заўважаў, што са Станіславам Аўгустам у Гродна прыехала тры кандытара і 5 чарнарабочых (потым дабавілі яшчэ чатырох) [2, с. 22]. Гэта сведчыць аб тым, што праца ў кандытарскай была нялёгкай і патрабавала значных высілкаў. У кандытарскай, як і пры кухні, былі свае вартаўнікі і прыбіральшчыцы. Іх заробак такі ж самы, як і ў кухонных працаўнікоў. Напрыклад, Я. П. Тышкевіч заўважае, што пры цукерні знаходзілася памывачка – яна атрымлівала 26 злп [9, с. 41]. Той жа М. Ф. Дэ-Пуле піша, што і пры галоўным буфетчыку Шульцу было 5 чарнарабочых [2, с. 22]. Гэта зразумела, бо адзін чалавек (Шульц)

дакладна не мог даглядзець увесь буфет і выканаць усе неабходныя справы ў ім, таму ён меў людзей, якія выконвалі дапаможныя функцыі.

Таксама трэба адмеціць такую пасаду, як кухонны вартаўнік. Аб ёй упамінае асабісты паж караля Ян Сагатынскі [8, с. 62]. Функцыя кухоннага вартаўніка была дастаткова простая – ахова кухоннага «дабра». Прычына існавання такой пасады была простая. Справа ў тым, што сярод некаторых працаўнікоў кухні, напрыклад, кухараў, часта можна было сусрэць несумленных людзей, якія кралі інгрэдыенты для каралеўскіх страў. Таму ў мэтах забароны падобных выпадкаў і існавала такая пасада. Калі казаць аб заробку кухонных вартаўнікоў, можна адзначыць тое, што ён быў зусім невялікі і амаль не адрозніваўся ад заробку кухчыкаў – кухонныя вартаўнікі атрымлівалі 26 злп [9, с. 46].

Так, М. Ф. Дэ-Пуле заўважаў, што па прыбыцці Станіслава Аўгуста ў Гродна разам з ім прыбыў мундшэнк Антон Луцынскі, а пры ім было 5 чарнарабочых [2, с. 22]. Як сведчыць Я. П. Тышкевіч, нават сярод іх існавала іерархія. У двух чарнарабочых пры мундшэнку, Міхала Градзіцкага і Андрэя Слаўскага, былі свае памочнікі – Палітоўскі і Бінкевіч [9, с. 45]. Канешне, заробак яны атрымлівалі з каралеўскай казны, але па статусу былі ніжэйшыя за двух папярэдніх. Таксама пры мундшэнку быў вартаўнік Валянцін Пухальскі – яго асноўным абавязкам была ахова каралеўскіх напояў, а заробак – 54 зл., меншы, чым у вышэйпералічаным чарнарабочых.

Дарэчы, і пры кухні, і пры цукерні працавалі жанчыны, якія сачылі за чысцінёй памяшканняў і інвентара. За сваю працу яны таксама атрымлівалі няшмат грошай – ад 26 да 36 злп [9, с. 40]. За чыстатою ў замку сачылі палацёры. Яны мылі падлогі, чысцілі іх ад пяску і шаравалі спецыяльнымі масламі і воскам. У кожнага палацёра быў набор сваіх інструментаў, уключаючы рознага роду венікі, шчоткі і анучы. Сапраўдны прафесіяналізм палацёра выяўляўся ў стварэнні чыстай і зіхатлівай паверхні падлогі без драпін і плям [5]. Да двара Станіслава Аўгуста ў Гродна прыехала 6 палацёраў [2, с. 22].

Не менш важную ролю пры двары адыгрывалі прачкі – жанчыны, якія займаліся мыццём адзення прыдворных асоб, у тым ліку і манарха. Са Станіславам Аўгустам у Гродна прыехала галоўная прачка Пецерсонава і 7 чарнарабочых. Я. П. Тышкевіч заўважае, што, акрамя галоўнай, пры двары Панятоўскага таксама была прачка Хмялеўская, якая атрымлівала заробак у памеры 54 зл., і дзве яе памочніцы, Раданоўская і Каноўская, чый заробак складаў прыкладна 36 зл. [9, с. 37]. Мабыць, праца дадзенага тыпу была сапраўды цяжкая, бо потым, як сведчаць запісы М. Ф. Дэ-Пуле, да сямі чарнарабочых было дададзена яшчэ 11 [2, с. 22].

Расійскі гісторык XIX ст, М. І. Кастамараў у сваёй працы «Апошнія гады Рэчы Паспалітай» упамінае такога прыдворнага, як апальшчык [4, с. 233]. Асноўным абавязкам дадзенай асобы было запальванне печы. Трэба заўважыць, што ў сувязі з тым, што апальшчык пастаянна знаходзіўся каля печаў, ён быў надта брудны, таму ён нячаста знаходзіўся побач з высокапрывеліяванымі асобамі, у тым ліку і з каралём.

Несумненна, у замку была ахова. Яна існавала пры кожнай «службе» і складалася пераважна з вартаўнікоў. На двор іх прыбыла васьмёра. Напрыклад, В. Пшэдзецкі быў вартаўніком пры гардэробе, Я. Бжазоўскі і Ю. Грудзінскі – пры прачкарні, В. Пухальскі – пры мундшэнку і г. д. Заробак у членаў службы аховы быў зусім невялікі – 40–55 зл., што ў 5-6 разоў менш, чым у высокапрывеліяваных прыдворных [9, с. 35]. Паўсядзённае жыццё прыдворнай чэлядзі значна адрознівалася ад жыцця высокапрывеліяваных асоб. Калі прыдворныя высокага рангу і працавалі пры двары, то нядоўга і няшмат, выконваючы пры гэтым «чыстую», нябрудную працу (падлік фінансаў і г. д.). Іх паўсядзённае жыццё было цікавым і разнастайным: наведванне балоў, вечарынак, тэатра, загарадныя прагулкі, візіты да ўплывовых асоб і г. д. Слугі жа нізкага рангу большую частку свайго часу праводзілі за фізічнай працай (мыццё падлогі, дагляд за коньмі і г. д.), якая была зусім нялёгкай. Пасля яе чалавек быў брудны, стомлены, і адзінае, што яму хацелася – гэта адпачыць ці паспаць. Не трэба забывацца і аб тым, што ў слуг была неабходнасць выконвання нейкіх асабістых спраў (мыццё адзення, прыгатаванне ежы і г.д.). Высокапрывеліяваныя ж асобы не ведалі падобнага жыцця.

Яны ведалі, што ўсе бытавыя справы выканае за іх прыдворная чэлядзь, таму і жылі дзеля сваёй асалоды, кантактуючы толькі з манархам і з такімі ж важнымі асобы, як самі, зусім не задумваючыся аб тым, што пры двары жыве яшчэ адна частка людзей – не такіх багатых і ўплывовых, але не менш карысных для іх і для манарха. Нягледзячы на тое, што манарх адносна добра адносіўся да шматлікіх сваіх прыдворных, на чэлядзь ён амаль не звяртаў увагі. Вядома,

што Панятоўскі часта кантактаваў з прывеліяванымі асобамі, перыядычна меў справы нават да прыдворных сярэдняга статусу, але крыніцы маўчаць аб выпадках зносін караля з прыдворнай чэляддзю. Аналізуючы дакументы, складваецца ўражанне, што для Станіслава Аўгуста, як і для астатніх уплывовых асоб, прыдворных нізкага рангу не існавала – яны бачылі ў ім простых слуг, але не такіх жа людзей, як самі. Акрамя таго, што працоўныя нізкага статусу практычна не кантактавалі з манархам і астатнімі прыдворнымі, яны нават адасоблена ад іх жылі – дзеля гэтага побач з палацам былі пабудаваны асобныя памяшканні для чэлядзі. Прычын для гэтага было некалькі: каб не было пахаў і бруду, а таксама з-за пагрозы пажару. Праўда, Н. Эліас, нямецкі сацыёлаг і гісторык XX ст., глядзіць на гэтую праблему з іншага боку, у першую чаргу звяртаючы ўвагу не на пажарную бяспеку, а на нежаданне іншых прыдворных жыць з кухоннай, стаеннай і іншай чэляддзю. Ён піша: «Адносная аддаленасць памяшканняў для слугаў і, першым чынам, кухонных пакояў, ад пакояў гаспадароў з'яўляецца характэрным выразам таго, што гаспадары жадалі як мага менш датыкацца да гэтых закулісных справаў. Прыдворная дама – не хатняя гаспадыня. Пра гэта сведчыць поўнае аддзяленне кухонных пакояў ад сферы яе нагляду» [7, с. 62]. І сапраўды, як піша Н. Эліяс, жывучы побач з чэляддзю, знаць вымушана была б чуць «крыкі, праклёны, дробныя злачынствы слуг і служанак» [7, с. 55]. А яна, канешне, чуць гэтага і ўдавацца ў падрабязнасці не жадала, бо яе зусім не цікавіла паўсядзённае жыццё прыдворнай чэляддзі, якая лічылася нейкім іншым тыпам людзей, людзей з «простага народу» [7, с. 64].

Дадзеныя асаблівасці паўсядзённага жыцця існавалі пры двары заўсёды, і прыдворныя ўспрымалі іх як негалоснае, але незмяняльнае правіла. Прывеліяваныя асобы адносіліся да прыдворнай чэлядзі ганарліва, нават жорстка, слугі ж ўспрымалі гэта як належнае. Яны не былі задаволены сваім становішчам, але разумелі, што па-іншаму быць не можа, таму ганарыліся тым, што з’яўляюцца слугамі манарха, а не якога-небудзь звычайнага шляхціца.

Такім чынам, пры двары Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Гродна пражывала вялікая колькасць прыдворных нізкага статусу. Яны працавалі на стайні, кухні і інш. Роля дадзеных асобаў была таксама дастаткова высокая, бо менавіта яны падтрымлівалі чысціню ў замку. Нягледзячы на тое, што высокапрывеліяваныя прыдворныя не жадалі кантактаваць з чэляддзю, менавіта дзякуючы ёй яны хадзілі па чыстай падлозе і любаваліся сабой праз чыстае люстэрка. Слугі ж ўспрымалі гэта як належнае, радуючыся таму што служаць такой важнай асобе, як манарху, а не каму-небудзь іншаму, менш уплывоваму.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Дарагастайскі К. М. Гіпіка, альбо Кніга пра коней. Мінск : Юніпак, 2007.
2. Де-Пуле, М. Ф. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. – СПб. : Тип. Майкова, 1871.
3. Журнал пребывания Его Величества Короля Польского, Станислава Августа в Гродно 1795–1796 гг. // Чтения в Императорском обществе истории и древностей Российских, при Московском университете. Июль-сентябрь. Кн.3., Москва, 1870. С. 1–157.
4. Костомаров Н. И. Старый спор. Последние годы Речи Посполитой. М. : Чарли; Смоленск : Смядынь, 1994.
5. Русские люди // Русская вера [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://ruvera.ru/gallery/russian_people_19. – Дата доступа: 07. 04. 2019
6. Скеп’ян А. А. Арганізацыя стаеннай службы пры магнацкіх дварах у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. // Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура. Мінск., 2017. С. 224–237.
7. Элиас Н. Придворное общество: Исследования по социологии короля и придворной аристократии, с Введением: Социология и история. М. : Языки славянской культуры, 2002.
8. Pamietnik bylego pazia Stanislawa Poniatowskiego, przy ktorym zostawal az do smierci. Poznan, 1845.
9. Tyszkiewicz E Króla Stanisława Augusta ostatni pobyt w Grodnie. Poznań, 1868.

## ИСТОРИЯ ГЛУХИХ БЕЛАРУСИ: РАННЕЕ СРЕДНЕВЕКОВЬЕ

**В. Ф. Мелеховец**

Минск, Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка, vlfdml@gmail.com

Автор доказывает, что крещение Руси создало условия для формирования гуманного отношения государства и общества к лицам с особенностями психофизического развития, проявления заботы о слабослышащих.